(2)

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# ТОПАС ДАРОГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ: ІНВАРЫЯНТНАСЦЬ СЕМАНТЫКІ

33-02-14/2015/2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дыпломная работа
студэнткі 502 групы
5 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура.
Журналістыка»
дзённай формы
атрымання адукацыі
Вашчылінай
Віялеты Ігараўны

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры

Пратакол № 10 ад 30.04.2015 г.

Абаронена 18.06 2015 г.
з адзнакай «10» дзесяць

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
Гоўзіч І.М.

Мінск, 2015

Scanned by CamScanner

## РЭФЕРАТ

Вашчыліна Віялета Ігараўна

# ТОПАС ДАРОГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ: ІНВАРЫЯНТНАСЦЬ СЕМАНТЫКІ

**Ключавыя словы:** мастацкі вобраз, топас, матыў, архетып, мастацкая прастора, проза, апавяданне, раман, аповесць, ідэйны змест.

**Аб'ект даследавання** – апавяданні Цішкі Гартнага «Думкі», «Шукаючы працы», «Дойдзем, сынок», «Бегунец», «Адвячоркам», «Прысады», апавяданні Якуба Коласа «Сяргей Карага», «Балаховец», «Крывавы вір», аповесці «У палескай глушы» і «У глыбі Палесся», раман Міхася Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі», алегарычна-філасофскі твор «Скарбы жыцця», аповесць «Меланхолія» Максіма Гарэцкага, апавяданні Кузьмы Чорнага «Жалезны крык», «Ноч пры дарозе», «Па дарозе», «Гаворка ўночы ў дарозе», «На пыльнай дарозе» і раман «Зямля».

**Прадмет даследавання** – намінатыўная і сімвалічная канатацыі топаса з прасторавым значэннем «дарога-шлях» у мастацкіх творах.

**Мэта работы** – вызначыць спецыфіку мастацкага ўвасаблення топаса «дарога» ў творах першай трэці XX стагоддзя.

**Метадалагічнай базай** навуковай работы сталі вучэбныя дапаможнікі па тэорыі і метадалогіі літаратуразнаўства, найноўшыя напрацоўкі ў галіне тэорыі літаратуры, даследаванні па гісторыі беларускай літаратуры. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы кагнітыўнага і кампаратыўнага аналізу, кампаратывістыка і герменеўтычны метад.

**Вынікі даследавання.** Работа з'яўляецца канцэптуальным літаратуразнаўчым даследаваннем, у якім прааналізаваны адметнасці рэпрэзентацыі топаса «дарога» ў беларускай прозе 1920-х – 1930-х гг., паказаны ідэйна-эстэтычныя функцыі вобраза дарогі ў творах розных аўтараў.

Матэрыялы даследавання маюць навукова-тэарэтычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры выкладанні дысцыплін літаратуразнаўчага профілю, падрыхтоўцы спецсемінараў і спецкурсаў па беларускай літаратуры, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner